Першая кніга паэта

**Віктар Слінко**

# *Апошні снег*

вершы
паэма

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1995

Віктар Слінко нарадзіўся ў 1972 годзе ў горадзе Івацэвічы. Скончыў сярэднюю школу № 53 (Мінск), а таксама Мінскі педагагічны універсітэт. Працуе перакладчыкам у Мінскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце. Вершы друкаваў у «ЛіМе», «Маладосці», «Першацвеце», «Нашым слове», «Чырвонай змене» і ў альманаху «Дзень паэзіі».

Узнёслы — шукаю
прыгажосць,
прыгнечаны — вострае лязо.
Усё патрабуе выйсця —
натхненне і самота,
словы і кроў…

ББК 84(4Беи)6
С47
УДК 882.6-1

Серыя заснавана ў 1968 г.
Прадмова Алеся Разанава

8820600000—065
С--------------- - 66—95
М302(03) — 95
ISBN 985-02-0054-5

© В. В. Слінко, 1995
© Прадмова. А. С. Разанаў, 1995

# ПАПЯРЭДНЯЯ ПАРА

Вершы Віктара Слінко я чытаў, калі ён яшчэ вучыўся ў школе і пісаў іх на рускай мове. Асаблівых заўваг да іх у мяне не было, апрача адной — ужо нават і не заўвагі, а пажадання: перарастаць напісанае. Мушу сказаць, што рос Віктар Слінко напорліва. І вось — першы паэтычны зборнік, які, на першы погляд, мае не зусім паэтычную і не зусім «першую» назву — «Апошні снег». Але калі мы ўчытаемся ў самі вершы, то ўбачым, што гэтая назва адносіцца не столькі да самога зборніка, колькі да той пары, з якой зрошчаны вершы і якая дае вершам мову.

Чалавечае жыццё ў сваім станаўленні праходзіць праз пэўныя стадыі — поры, кожная з якіх па-свойму ўбірае і замыкае ўсё жыццё і, перш чым перайсці ў наступную, памірае. Сутнасць паміранння — у пераходзе. Не з'яўляючыся ўсёй рэчаіснасцю, а толькі яе актуалізаваным модусам, чалавек становіцца незваротным для сябе і мусіць пакідаць у мінулым тое, што пэўным чынам з'яўляецца ім самім, а тое, што з'яўляецца ім самім,— яго.

Гэта — пара, калі страта пераважае набытак, пара папярэдняй смерці, і якраз з гэтай пары, выяўляючы яе ў сваіх вершах, і вырастав Віктар Слінко.

У свае юныя гады ён шмат прачытаў, перажыў, перадумаў, яго вершы, як споведзь, гучаць

надзвычай шчыра і мужна. Інакш яны і не атрымаліся б, інакш мяжа між тым, хто застаецца тут, і тым, што застаецца там, не была б такой празрыстай, а далечыня, адкрытая стратай, такой знаёмай.

Людзі, птушкі, дрэвы: усё тое, што адчувае сваю безабароннасць і нетрываласць у свеце, што прадчувае магчымасць расстання,— знаходзіць у іх свой водгук, знаходзіць свой узаемны рух. І гэты узаемны рух, прыкмета праўдзівай паэзіі, нам кажа аб тым, што не «самазамкнёнае» лепшае мусіў бы шукаць чалавек у жыцці, а істотнае -— тое, што з'яўляецца адрынутай, страчанай, адасобленай часткай яго самога...

Вядучы матыў у паэзіі Віктара Слінко — развітанне, ён і ў паэзію прыходзіць, як бы развітваючыся з ёю. Не бяруся прадказваць і прадвызначаць яго далейшы шлях. Як усякага сапраўднага «прызванніка», яго вядзе «неспазнаная мэта».

У «Вершы на развітанне», якім завяршаецца зборнік, Віктар кажа: «Я — сакавік, якому ўжо Ніколі Не стаць красавіком». Не буду спрачацца з тым, з чым спрачацца не выпадае, хачу толькі зазначыць, што кожны месяц — ён і папярэдні, ён і наступны і што паэзіі належыць не адно толькі сакавік, а і ўвесь год.

Спадзяюся, Віктар Слінко пераканаецца ў гэтым і сам.

*Алесь Разанаў*

* * *

Не цвіце яблыня гэты год.

Заклалі падмурак – будзе тут хата,
тут, дзе зараз яблыня.
Не наракае яблыня, што яе зрэжуць.
У глыбіні яе думак, у вышыні
яе веця, у моцы яе каранёў
свая размова з зямлёй,
свой час.
Зрэжуць яе – не будзе знаку,
што была.
Адчувае і не цвіце.
Вяртаюся дахаты. Ціш, няма ветру,
і толькі яблыня шамаціць кронай,
спыняючы мяне. Глядзіць на мяне,
глядзіць праз мяне.
У яе скроні стукае падземная кроў,
у яе розуме тоіцца невядомая думка.
Не цвіце.

## БЛІЗНЯТЫ

Раз'яднанне не даруецца.
Адзінае не раз'ядноўваецца.
Блізняты — дзве дзяўчынкі,
Света і Таня — разам
прыйшлі ў свет, каб разам
пакінуць яго.
Яны заўсёды былі разам: у гульнях
і ў працы, дома і ў школе.
Нават хадзілі ўвесь час разам,
трымаючы адна адну за руку.
Скончылі дзяўчынкі школу,
паступілі ў інстытут.
Яны сябравалі толькі паміж сабой,
заўсёды — толькі паміж сабой.
Чым больш яны былі разам, тым
больш адчувалі, што чужыя тут —
хоць любілі іх і настаўнікі, і
навучэнцы. Кожная з іх глядзела ў свет
і не бачыла нікога, акрамя сваёй
неадрыўнай паловы. У далоні далонь.
...Скончыліся заняткі, і дзяўчынкі,
трымаючыся за рукі, падышлі да адчыненага
вакна.
Не было нікога навокал. Ніхто
не змог уратаваць іх ад апошняга,
канчатковага аб'яднання. Ніхто не мог
уратаваць...

## ПАВУК

Павук — стварэнне зразумелае,
бо ўсё ў ім падпарадкавана адной мэце:
жыць. І ніякіх адступленняў ад гэтай
мэты. Ён старанна пляце павуціну, а
потым Чакае. О, каб людзі ўмелі так
Чакаць!..
Калі павук гіне — нікога не кранае яго
смерць. Павуку не бывае радасна
або сумна, добра або дрэнна — ён
толькі Чакае.
Я — чалавек. Адзінае, што мяне яднае
з павуком, гэта мэта — жыць. Калі б
павук мог думаць, ён бы стаў філосафам –
у яго дастаткова вольнага часу...
Калі б я мог так Чакаць, я б,
рапэўна, стаў павуком.

## БОЖАЯ ПАЗЫКА

Вада-жывіца ў маім жбане: каму трэба?
Нёс здалёку, бо людзі паміраюць дачасна,
калечаць душы.
Каму трэба? Нікому…
Звыкліся людзі з парэзамі на тварах
і на душах, звыкліся.
Старыя кажуць: навошта нам?
Хутка паміраць.
Маладыя кажуць: няма нам чаго загойваць.
Маладыя мы.
Баяцца людзі прызнацца адзін аднаму
аб сваіх стратах і шкадаваннях, баяцца
паверыць у сілу вады-жывіцы.
І тады я сказаў: «Гэтая вада –
Божая пазыка. Бог яе даў, дык бярыце.
Божую пазыку не трэба аддаваць».
І людзі паверылі і сталі піць ваду-жывіцу
са жбана. А вады ўсё не меншае…
Пакінуў я жбан людзям.
І няма ў іх больш ні страт,
ні набытку. Ёсць толькі Божая пазыка,
якую не трэба вяртаць.

## АРЭЛІ

Чым вышэй мае арэлі,
тым лягчэй за іх трымацца.
Калі глядзіш толькі ў неба,
становішся птушкай і хочацца вышэй,
калі глядзіш на зямлю, баішся ўпасці
і ўспамінаеш, што ты чалавек.

Разгойдваю арэлі, а тыя, хто
на зямлі, ужо не крычаць –
баяцца, каб я не спалохаўся.

У палёце свая страта – зямля.
Я чую голас
са страчанай зямлі:
ты толькі паглядзела на мяне,
а я ўжо пачуў.
Матуля… Я хацеў ляцець, і тут
адчуў, што магу толькі падаць,
а ты падставіла далоні:
сюды, сынок…

## ШКЛО

У каморцы зазвінела і разбілася шкло.
Бабка мне казала: не хадзі пакуль
туды, там наш з дзедам скарб.
А калі ты адчуеш, што табе нечага
не стае ў жыцці, схадзі туды і вазьмі,
што табе трэба.
Згубіліся ключы ад каморкі.
У роспачы я, у адчаі: як
цяпер зайсці туды?
Як узяць тое, чаго мне не стае
ў жыцці?
У каморцы звініць і б’ецца шкло.

* * *

– Ты баішся плыць? – пытае мой сябар,
уваходзячы ў ваду.
Падхоплівае яго рака. Лёгка-лёгка плыць,
бы ўперадзе кліча неспазнаная мэта,
бы ўперадзе калышацца на вадзе
прыгажуня-лілея.
А на беразе не застаецца нічога,
і нічога ўжо не трымае – усё
забірае спакойная плынь…
Абарваў сябар лілею сваёй неўміручасці,
і пабег удалечыню па вадзе,
глыбей і глыбей…

Не пускала зямля,
не пускала вада. І толькі
на саракавы дзень узляцела над
ракою птушка, трымаючы ў дзюбе лілею,
што ён абарваў.

## ХОВАНКІ

Завіхаюцца дарослыя ля жывёліны:
накарміць трэба і кароў, і парсюкоў.
А я нічога не раблю,
я гуляю з сябрамі ў
хованкі.
Схаваўся я за дрывотняй.
А мой сябра Мікола зайшоў
за дрывотню і паглядзеў на мяне…
і пайшоў. Не ўбачыў.
Пайшлі сябры дамоў, дарослыя зачынілі
жывёлу і таксама пайшлі.
А я застаўся за дрывотняй –
непакліканы дарослымі, сябрамі забыты.

Хаваюся ад сябе, каб убачыць
нябачнае і пачуць нячутнае – тое,
што хаваецца ў маёй душы.
А я тагачасны хлопчык, так і
застаўся там, за дрывотняй.

## ПРАГАЛІНЫ

Прагаліны на зямлі.
Растаў снег, але растаў ён
толькі тут, на гэтым месцы.
Прагаліна.
Дзеці бягуць да прагалін – ім
падказвае розум, што тут ужо вясна.
На прагаліне трава, але вакол яшчэ снег.
Тут жыццё, але вакол яшчэ смерць.

Не веру прагалінам.
Яны тояць падман.
Паверыш, і збудзішся, і не
саромеешся радасці, але пойдзе снег
і засыпле надзеі і спадзяванні,
радасць і трывогу.

Зняверыўся – не зразумелі людзі…
Яны паверылі. Няхай.
Узрадаваўся, што не зразумелі.
Жывуць хай сёння – заўтра будзе снег.

## ВОСЕНЬ

Вось ужо шкрабе аб спод
лыжка, а полымя, якое гарэла так
ярка, стала гасіцца само,
а руплівыя жнеі зносяць у
снапы мёртвыя каласы: жнеі
рыхтуюцца да зімы, жнеі рыхтуюцца,
каб сытна было ўсім.
На таку б'юць цапы.
Восень.
Выбівае цэп з мяне лета,
успаміны аб ім.
«Ты чый?» – праязджаючы на веласіпедзе,
спытаў мужчына.
Я паціснуў плячыма. Хіба я ведаю, чый я?
Прыехаў у вёску, а тут – восень.
Прыйдзе новае лета, і прыедзе ў вёску
новы чалавек з маім імем, з маім
розумам і пачуццямі.
Але гэта буду ўжо не я.
Маё лета мінула.

## КРОК

Адзін крок – ад мяне да цябе.
Як шмат – адзін крок… Не пераадолець.
Не ўзяць далонь тваю ў рукі,
не прыціснуць да вуснаў.
Што змянілася?
Нічога не змянілася.
Ты зрабіла крок назад: усяго адзін крок.
Мне не зрабіць крок да цябе: сцяна.
Я размаўляю з табой, ты мне
ўсміхаешся.
Такая ж блізкая. Адзін крок.
Адзінае выратаванне: верыць, што
калі-небудзь ты зробіш Адзін крок –
насустрач.

* * *

Хочацца зрабіць болей, але не атрымліваецца. А людзі? Мне няёмка з людзьмі. Часам мне здаецца, што я ведаю пра іх тое, чаго не ведае ніхто. Ілюзія, падман. Я такі ж, як і ўсе.
А яны зычліва кажуць: «Нічога, усё будзе добра, усё пройдзе».
Я ведаю, што яны пройдуць міма. А яны кажуць: «Гэта дзяцінства». Няўжо космас, зоркі – гэта дзяцінства?
І ўперад, уперад! Не пакідае адчуванне, што тыя дробязі застаюцца незаўважаныя: забытая кніга, размова ў аўтобусе.
Азірнешся – што было ў іх? – у забытай кнізе… Аб чым тая размова? Але не дакрануцца да кнігі і не ўспомніць ні слова. Мы занадта далёка адышлі.
І памром у хвіліну няшчасця, а тыя хвіліны, дзеля якіх варта жыць, мінулі незаўважаныя.
У тыя хвіліны і трэба было памерці.
Мы знікаем. Галоўнае засталося ззаду.

**АРГАН**

Няма аргана, бо забралі.
Даўно.
А сабор зараз рамантуюць.
Людзі моляцца пры ўваходзе:
стануць на калені і моляцца.
Пад нагамі – халодныя камяні.

Прайшлі гады.
Храм паклікаў мяне.
«Знімі шапку», – сказала жанчына ў
чорным, калі я ўваходзіў.
Ацярушваецца пыл з ботаў.
Ацярушваецца з мяне не маё – калі
я ўваходжу.
А высокая столь пытае: «Ты чуеш?
Ты чуеш, як гучыць арган?»
Забралі арган яшчэ ў вайну.
І цяпер няма яго.
А высокая столь пытае: «Ты чуеш?
Ты чуеш, як гучыць арган?
Ён размаўляе з табой».
Я пазіраю на каляровыя вітражы:
разнаколернае святло падае ў сабор.
Высокую столь падтрымлівае неба,
на зямлі збудаваны сабор.
Я чую арган.

## БЯРОЗА

Трызненне ветру і бярозы стогны
і ўтрапёны позірк мой –
у бездань, у нябыт.
...Хутка вернецца з працы бацька,
і маё чаканне – доўгае-доўгае.
Чаканне – пакуль адыдзе
прэч ад мяне ўсё, што паўтараецца
кожны дзень: клопаты, спрэчкі,
мітусенне – маё і ўсіх, хто
жыве ў хаце са мной...
А потым мне будзе сорамна і крыўдна –
навошта ўсё? Навошта ўсё гэта?
А вецер не супакоіцца, і будзе
шаптаць, і крычаць, і лямантаваць – а
родныя скажуць: «Якое дрэннае надвор'е...»
Няўжо яны не чуюць ветру?
Няўжо яны не разумеюць яго?..
А бяроза стогне – нібыта ёй баліць...
Але я ведаю, што пакуль бяроза
стогне – яна жыве. Вось і зараз: усё
мацней вецер, і ўсё мацней голас бярозы:
«Я жыву, жыву, жыву!»

## АДЗІН

Узнёслы – шукаю прыгажосць,
прыгнечаны – вострае лязо.
Усё патрабуе выйсця –
натхненне і самота,
словы і кроў... Ім бывае цесна,
калі я адзін.
Усё патрабуе выйсця –
вельмі хуткага,
часам бязлітаснага і безнадзейнага.
Супакойваю сябе: «Пачакай трохі».
І тут разумею: я
і на гэты раз не паспеў.

* * *

Ехалі з сенажаці дзед і я
на возе. А конь быў малады і
панёс. Дзед шэпча: «Лажыся, унучак,
на дно і трымайся». І сам лёг
каля мяне.
Воз кідала з аднаго боку ў другі,
а дзед – спакойны. Я ўспомніў, што ў
маладосці дзед быў кавалерыстам. Нават
фотакартка захавалася: стаіць ён
з шабляй у руцэ – высокі, статны.
А конь нёс, нёс і спыніўся:
малагодак, неразумны конь. Дзед
пугай ляснуў: «Н-но, дурное, н-но!»
…Бацька і маці глядзелі, ці
не зламаў я чаго, ці не пашкодзіў я
рукі, ногі.
Пасля вячэры дзед сказаў мне:
– Ведаеш, каб я ў возе быў адзін,
калі панёс конь…
– Дык што, дзеду?
– Нічога. Добра, калі старому
чалавеку – маладая смерць… Старое
дрэва чакае маланкі, унучак.

* * *

Да змяркання яшчэ гадзіна,
а ўжо зараз усё вакол мяне
поўніцца ім:
людзі спяшаюцца ў кватэры,
птушкі – у гнёзды да птушанят,
а я іду да змяркання.

Усе жывуць у дні, а ў змярканні – хто?
Толькі самотныя дрэвы…

Таму я іду да змяркання –
піць ваду з азёр маёй Беларусі,
дыхаць водарам пожні,
верыць у лепшае.

Змярканне размаўляе са мной,
дорыць мне свае таямніцы: як
быць з людзьмі і быць чалавекам,
як хадзіць басанож па пожні
і не параніцца.
Ужо не дзень, яшчэ не ноч:
змярканне. Я сустрэну цябе.

## ШЛЯХ

*Алесю Разанаву*

Нас зноў чакае шлях.
Адзіны адпачынак – ісці, ісці.
Нявыказаныя надзеі бацькоў, праклёны –
што нам да таго?
...Мы раптам пасталелі.
Адкуль ведаю я, дзе пачаўся наш
шлях?
Ён падобны на юнацтва, якое ніколі
не скончыцца. На дзяцінства, якое
сонечным хлопчыкам бяжыць па зямлі.
Цікава жыць, але страшна паміраць.
Таму і кажу я: смерць – гэта
калі толькі на імгненне сонца
схаваецца за аблокі і сонечны
хлопчык павінен заснуць. А праз
імгненне – зноў жыццё.
...А той, хто попелам стаў,
хто лёг у зямлю, каб узышло
калоссе – як яго імя? Вось, вос яно,
калоссе – паабапал дарогі. Толькі
падыме свае галовы вышэй за маю
галаву – усё. І здарыцца – той,
хто хацеў мне дабра, збіваў
маю дамавіну.
І не пытайся... Усе кажуць:
дабранач, а я – Добрай раніцы,
шлях!

## МОГІЛКІ

У старой вёсцы, дзе жывуць старыя людзі, ёсць могілкі, на якіх пахавана Даўніна. Сын майго прадзеда, Лёнька, неяк гуляў па возеры, напіўся вады з палонкі і памёр ад запалення лёгкіх. Ён пахаваны тут. А мой дзед – яго звалі Віця – памёр ад гарэлкі... Яшчэ даволі малады памёр. Мяне таксама завуць Віця – і дзесьці я чытаў, што шмат хто з тых людзей, якія носяць гэта імя, памруць ад гарэлкі... Ну і добра. Добра ведаць, ад чаго ты загінеш.

А мой прадзед... Ён жыве і дагэтуль. І адзінае, што ён ведае, пражыўшы амаль дзевяноста год, адзінае, у чым ён упэўнены, – шчаслівы той чалавек, які не нарадзіўся на свет.

– Хіба гэта так? – пытаў я прадзеда.

– Так, унучак. Жыццё маё было доўгае, і я паспеў гэта зразумець...

Мы сядзім каля ганка. І я хачу, каб мой прадзед жыў доўга, але... У яго валасах – Даўніна. І я бачу тыя суніцы, якія растуць Там, але нельга іх ірваць. Я бачу, што мой прадзед ведае нешта, але ніколі ён не скажа мне тыя словы, бо мне трэба яшчэ доўга жыць. І я павінен жыць, і я буду жыць... пакуль не спраўдзіцца маё імя – Віктар.

* * *

Пазбягаю людзей.
Пазбягаю гутарак, цікаўных позіркаў.
Пазбягаю шумных вечарын.
Пазбягаю адзіноты.

Іду па вуліцы, мяняю кірунак, іду
разам з людзьмі і асобна ад
людзей і раптам спыняюся.

Ішоў дождж – якраз той, які
стукаўся ў маё вакно і якому я
не адчыніў, – ішоў дождж і
пакінуў лужыны.
Я паглядзеў у ваду.
Хто гэта?
Я так доўга пазбягаў з ім сустрэчы…

## ЗНІКНЕННЕ

Толькі што быў я – і знік…
Няма мяне. І будуць шукаць, і
знойдуць – толькі не тыя, хто
мяне любіць і каму я патрэбен.
У чужой краіне, на выспе, прачнуся
я…
І выпадкова натрапяць на мяне людзі –
у прыгожай вопратцы, з добрымі тварамі.
Пачастуюць смачнай ежай, спытаюць пра
сёе-тое, а потым скажуць: «Ідзі…»
– Куды? – спытаюся я.
– Туды, дзе цябе любяць,
туды, дзе ты патрэбен.
І я буду шкадаваць, што знік.

## ДАМОВА

Пішу лісты сябрам.
Кароткія лісты.
І паўстаронкі не займаюць
намеры, спадзяванні — словы ўсе
сціскаю ў кулак.

Адзін сябрук — інструктар-альпініст.
Я ведаю — ён прыйдзе ў лагер
і пададуць маё пісьмо яму.
Ён прачытае, некалькі радкоў
чыркне.
Дамова паміж намі: калі ён
аднойчы з гор не вернецца, то мне
яго сябры дашлюць пусты канверт.

Пішу сябрам кароткія лісты.
А вось знянацку выпадае
ліст з паштовай скрыню: што
ў ім?
Хачу чытаць, і страшна паглядзець.

## ВАГІ

Шалі вагаў хіляцца то ў адзін бок,
то ў другі.
Я кідаю на вагі
свае ўчынкі,
здзекі і міласэрнасць, сваю літасць і
бязлітаснасць.

Я залежу ад вагаў.
І з цягам часу маё
існаванне падпарадкоўваецца
ім: вагі вырашаюць
за мяне, вагі кіруюць
мной.

Я выпростваю плечы.
Я адхіляю перасцярогу
вагаў. Хай нават
пераважыць горшае –я
аспрэчваю іх права
кіраваць маімі думкамі
і ўчынкамі.
Я аспрэчваю саму іх неабходнасць.
Але тады вагі пачынаюць аспрэчваць
неабходнасць маёй прысутнасці ў свеце.

Я шукаю – ці ёсць
ува мне тое, што не
належыць вагам?
Што ўва мне маё?

## АТРУТА

Назбіраю ў лесе розных ягад
і грыбоў, прынясу дахаты і стану
думаць: што можна есці, а што не?
Што тут атрута? Я не ведаю.
Выберу тыя грыбы і ягады, у якія,
як мне здаецца, прырода заклала атруту.
Я згатую ежу менавіта з іх – бо чалавек
часцей памыляецца ў сваіх учынках, чым
прымае вернае рашэнне.
Калі я застануся жывы, то падумаю,
што памыліўся ў лепшы бок.

* * *

Павага да асяроддзя,
Павага да разумных людзей,
Павага да змяі, якую патрывожыў.
Яна ўзняла галаву і пачала
выпроставаць свае пругкія кольцы.
Момант – або ты ўцячэш, або
прыгнешся да зямлі – каб
твар на ўзроўні твару,
каб вочы на ўзроўні вачэй.

Усё роўна маланкавы кідок хутчэй
за чалавечы рух. І таму – вочы
на ўзроўні вачэй.

Хто не вытрымае, адвядзе позірк?
Войны і пажары ў краінах,
а ў лесе стаіць, укленчыўшы, чалавек,
а насупраць – змяя. Не адвесці вачэй.

## ЖАБРАК

Са званочкам на шыі ідзе па
вёсцы сляпы жабрак.
Усе даюць яму, што маюць:
Марыля паклала ў торбу жабрака
акраец хлеба і шматок сала,
Ганула толькі што выдаіла кароўку
і запрасіла сляпога ў хату –
пачаставацца малаком.
А Люба нічога не дала,
А Люба нічога не сказала.

Сляпы жабрак моўчкі прымаў хлеб
і сала, піў малако. Не заўважыў
ні Марылі, ні Ганулі і не
падзякаваў.
Да Любы звярнуўся,
Любу пазнаў сляпы.
– Дзякуй, што не дала нічога,
дзякуй, што не пашкадавала,
званочак мой: дзінь-дзінь!
Хто зразумее сляпога?
Ідзе па вуліцы жабрак,
стаіць Люба і глядзіць услед.

## МАТЫЛЁК

Сутонне бору, і ты цалуеш
мае валасы.
– Чаму ты такі маленькі? –
калі я цябе на руках трымаў,
ты пыталася.
Я жыў цеплынёй тваіх ног…
Твае ногі – крылы матылька, крылы
матылька на трэці дзень яго жыцця.
Я часта трымаў цябе на руках –
невялікая ў іх моц, але хапала
табе гэтай моцы.
Худы і непрыгожы я, дваццацігадовы,
а ты, матылёчак, кранаеш шчакой мае вусны,
і табе пяць год – чалавечых
год – і матыльковыя тры дні.

* * *

Рэжу яблыкі, рэжу і рэжу,
а нож слізгае і слізгае
і ўсё ніяк не зачэпіць руку –
баіцца рука.
Падаюць яблыкі ў мяккі мурог,
некуды вяртаючыся і вяртаючы нешта,
штосьці забіраючы з сабою і штосьці
назаўсёды аддаючы.
Збіраю яблыкі – збіраю даніну, што
аддае сад, – а я калі сваю даніну
аддам?..
Рэжу яблыкі, слізгае нож , і ўжо зусім
не баіцца рука, і ўжо зусім не баліць…

## ЖОЎТАЯ КАШУЛЯ

Надзяваю жоўтую кашулю.
Кагосьці – ці не мяне? – застрэлілі
ў вайну,
кагосьці – у жоўтай кашулі.
– Навошта ты надзяваеш яе?
Немцы першымі забіваюць тых,
у каго жоўтая кашуля, – кажа
мне бабка, што ўсюды ходзіць з клункамі,
бабка, што дагэтуль не прыйшла з вайны.

Збіраю клункі, але не збяру.
А на вуліцы грукочуць боты,
а на вуліцы стрэлы і дым.

Паварочваецца кола часу.
На жоўтай кашулі чырванее вайна.

## ЗЯМЛЯ

Закрыюць вочы нам,
Зачыняць нашы хаты.
Тады нам і адкрыецца зямля.

Рухаюся з аднаго месца ў
другое.
Вось дрэвы – я не ведаю
іх назваў, але яны
застаюцца дрэвамі.
Птушак, што лётаюць вакол
мяне, я не бачыў таксама
ніколі, але яны застаюцца
птушкамі.
Я прайшоў усю зямлю,
але так і не скрануўся з месца.
Куды б ні ішоў, я
заставаўся на Зямлі.
Зорныя сусветы зіхацяць і вабяць,
але пад нашымі нагамі
найбольш таямнічы сусвет.
А людзі баяцца канца свету
і маланкі больш, чым проста
смерці...
Кажуць, што жыццё – сейбіт,
а смерць – жняя.
А мне здаецца, што смерць –
таксама сейбіт... Яна нам дорыць
свежую раллю.

## МОЎЧКІ

Кошт аднаго майго слова,
кошт аднаго майго гука – ці вялікі?

Зямля век за векам рухаецца вакол
сонца – моўчкі,
зоркі свецяцца і пульсуюць– моўчкі.
Цурчыць вада – яна размаўляе
сама з сабой, а значыць – маўчыць.

Я выходжу з горада ў поле – дзе
людзі, там шмат слоў.

Натхненне прыйдзе,
а вакол цемра.
Намацаю рукой аловак і пішу...
Без слоў размаўляе са мной
маё сэрца.

* * *

Словы ўвабралі далечыню
і ўжо не словы –
не то смех討 гругана,
не то іскрыпка заводзіць
спрэчку з чалавечай рукой.

А мае вершы хварэюць жыццём.
Пакуль жыву, дзялю напалову вершы –
агню і мне, а памру – усё спалена будзе.

Груган у вышыні гутарыць з аблокамі –
шукае сваю зямлю;
плача па мне іскрыпка,
гарацьі не спальваюцца мае вершы.

**БУСЕЛ**

Упаў бусел на двары падбіты,
занеслі мы яго ў хату.
Доўга ён быў у нас, а
ўсё ніяк не мог ачуняць –
пашкоджана нутро.
Кармілі мы бусла жабамі –
рэзала маці іх нажніцамі,
бо цэлую жабу ён не мог адолець –
і цяжка было яму, буслу,
есці з чалавечых рук.
Цёпла мне на печы, а
яму каля печы няўтульна –
хоча клекатаць, ды не можа
і стогне…
Хадзілі мы за ім, але ўсё
горш і горш станавілася буслу.
Аднёс я бусла ў лес,
каб не бачыць яго пакут,
каб жыла надзея – можа, у
лесе ачуняе бусел?
Рабілі мы ўсё, што маглі,
ды нічога не зробіш – пашкоджана
нутро.
У маім дзяцінстве стогне падбіты
бусел.

## НАСТАЎНІК

Холадна навокал.
Баліць і вярэдзіць сэрца.

Падае снег
і выяўляе мае абрысы,
акрэслівае – дзе я і
дзе ты, мой настаўнік;
усё гэта – да вясны,
да снегасмерці,
да першых крокаў снегу,
калі я перастану адрозніваць,
дзе мае думкі і дзе твае.

Падае снег. Вунь твой
шлях, – кажа мой
настаўнік і паказвае на
белы прасцяг, – вунь твой
шлях.
Спяшайся прайсці яго да
вясны.

## БАЦЬКА

Працуе бацька з людзьмі.
Як зробяць усё, пойдуць есці
і піць.
Гутарка за сталом: людзі
прыйшлі папрацаваць і пагутарыць,
і мой бацька – адзін з іх.
Падымаюцца, дзякуюць, але
бацька ніколі не адпускае іх
проста так.
Ён вядзе людзей у залу
і дастае свой баян.
А баян грае дрэнна,
але бацька вельмі хоча
пайграць людзям, каб яны
адчулі, каб адчуў баян… і
каб сам бацька адчуў, што ён яшчэ не стары.
Рыпяць мяхі, сіпяць, і тут
прарываецца з хрыпу мелодыя,
бацька нагінае галаву да баяна,
і маладзее баян, і маладзеюць людзі,
і маладзее бацька…
– Грай часцей, – кажу я бацьку.
калі людзі пашлі.
– Грай часцей…
Але бацька не можа, бо
нельга часта вяртаць маладосць.

Хай прыйдуць людзі.
Хай бацька дастане баян.

* * *

Святла струмені пакідаюць нас.
Заснула хата.
А хтосьці ходзіць па двары…
Назаўтра ўбачым, хто, –
шурпаты снег
яго слядоў адбіткі зберажэ.
Хто – ён? Хто непакоіць сны?
Усіх хвалюе гэта – не мяне.
Я перайшоў мяжу прастору сноў.
Я перайшоў мяжу – мае адбіткі
шурпаты снег збярог.

Я ноччу паглядаў на хату.
Я ноччу на двары хадзіў.

Я ў хаце быў.
Я чуў,
што нехта ходзіць па двары.

* * *

Увечары выходжу на поле,
увечары выходжу я…
Прыйдзе мой лось, як прыходзіў заўсёды,
і пакладзе на маё плячо
сваю цяжкую разумную галаву.
Дзіўная сустрэча. Не сустракаюцца
цемра і святло, і ўсё ж…
Агонь свечкі ў маіх вачах,
і ў тваіх вачах агонь – агонь
пажараў, агонь боек, агонь
крыві і жыцця.
Прыношу табе хлеб, але не па
хлеб ты прыходзіш да мяне –
ты прыходзіш пакласці галаву
на маё плячо…
Назаўтра вясковы паляўнічы Іван
скажа, што бачыў на палетку сляды лася,
і сядзе ноччу са стрэльбай у кустах.
…Скажы мне, мой лось,
чаму я так цяжка засынаю?
Снілася мне, што прыйшоў лось і я
таксама прыйшоў.
Не дачакаліся родныя мяне,
пайшлі шукаць. І тут прагучаў стрэл:
цэліў Іван у лася, а трапіў у мяне.
Знайшлі кроў і ласіныя сляды
і раптам убачылі маю агністую постаць,
што палымнела крывавай свечкай,
паказваючы ласю карацейшую дарогу ў лес.

* * *

Хлопцы і дзяўчаты з Гарадзішчаў
сабраліся на вячоркі.
Спявалі, танцавалі, і каля апоўначы,
калі стаміліся многія
ад спеваў і скокаў, нехта прапанаваў
пагуляць у «шыбеніцу». Адзін за адным
хлопцы, а за імі і дзяўчаты паказвалі,
як яны вешаюцца на вяроўцы,
а Іра кажа: «Давайце я…»
Усе засмяяліся, бо Іра –
вясёлая дзяўчынка, заўсёды,
бы сонейка, усміхаецца.
І як толькі паклала яна галаву
ў пятлю, адразу пагасла лучына,
падзьмуў вецер праз шчыліны ў вокнах,
стала страшна ўсім. Выбеглі дзяўчаты
і хлопцы з хаты, а Іра засталася –
забыліся на яе…
Сонейка апоўначы не свеціць.

## ВЕСТКА

Хістаецца поўня.

Вестка, што прыйшла:
паштоўка,
словы, кінутыя дзяўчынкай,
лісце, што ўпала на вакно…
Мабыць, вестка аб нараджэнні дзіцяці,
а можа, вестка аб смерці далёкага сваяка,
якога я ніколі не бачыў.
І я еду на хрысціны ці на
пахаванне – я еду вітацца
або развітвацца з часткай
свайго сусвету.
Хістаецца поўня.
Апошнія гады я часцей развітваюся,
чым вітаюся, і ўсё неспакойней
у маім сусвеце.
І мне цяжка захоўваць раўнавагу
паміж сабой і ім,
усё цяжэй атрымліваць весткі.
Хістаецца поўня – яна ўтрымлівае
маю раўнавагу.

## СВЕДКА

Назіраю за вадой.
У празрыстай вадзе не патоне
празрыстае неба – пакуль яно
празрыстае… Воблакі непакояць
ваду, воблакі баламуцяць, робяць
непрыгожым твар вады.
Спакойнае неба – спакойная вада.
Глядзіцца люстэрка ў люстэрка,
сусвет у сусвет.
Я тут лішні.
Непатрэбны сведка.

* * *

Мне маці перахрысціць спіну,
калі пайду я з хаты ў белы свет.

Кладуся спаць. Амаль ужо засну,
а маці падыходзіць да мяне
і перахрысціць твар мой…

Я выкляты з дзяцінства.
Ні за што.
Мой бацька шмат гадоў назад
у бойцы сыну бабкі-варажыхі
зламаў руку.
І бацька мой быў выкляты,
і я — як сын яго…
Калі пайду я з хаты ў белы свет,
за мной — праклён.
А паміж мной і ім — мая матуля.
Яна мне хрысціць спіну — хоча
праклён той адагнаць…
Не адагнаць яго і не спыніць мяне.

## ПРЭЛЮДЫЯ

Надзеяй выспяваў я
Гадзіначку, што спаў.
Тужлівы ранак сніў
Пад гоман ґонкіх сліў,
А выйшаў на парог –
Душою занямог:
Ад вялікіх хат
Да малых зярнят
Едуць два вазы,
Дзве вязуць слязы.
Там, дзе плач дзяцей, –
Там сляза лягчэй.
Там, дзе плач жанчын, –
Цяжка, хоць крычы.
Стогне бедны конь.
Шлях адзін – у скон.
Дзе наш плач – там спеў,
Дзе палац – там хлеў.
Едуць два вазы,
Дзве вязуць слязы.

## НЕ БЫЛО

Полымем запалюся,
Полымем запалюся,
Полымем запалюся –
                                        на зямлі на роднай
да крывіначкі згару.

Белай птушкай з’яўлюся,
Белакрылай з’яўлюся,
Белай птушкай з’яўлюся
І ўпаду на правады
І адразу запалюся…
Адлятаю
                        немаведама куды.

Людзі скажуць – не было мяне,
Людзі скажуць – ім здалося:
Толькі полымя мільгнула,
Толькі белае крыло…

## ПЧАЛЫ ПАЧАТАК – МОЙ...

…Але ў глыбіні існавання пчалы
тоіцца плач.
*Алесь Разанаў*

Начная зорка дагарае ў небе,
А зорка дня запаліць небакрай.
Начная зорка – ты не дагарай,
Ты не згарай – тады не развіднее.

І будзе ноч, пакуль ты льеш святло.
І буду я – пакуль не згаснеш ты.

А пчолы плачуць…
Святло далёкай зоркі
Іх будзіць, пранікаючы
У вулей.
Бо зоркі – гэта кветкі, на якіх
Пчалы ніводнай. А нектару шмат.

А душы пчол загінуўшых ляцяць,
Ляцяць да зоркі – да духмянай кветкі.
Але нектару не збіраюць душы…
І душы клічуць ты, хто на зямлі,
Ляцець туды – ляцець збіраць нектар.

А пчолы плачуць: толькі пасля смерці.
А пчолы плачуць: моцы не стае.

Пчалы пачатак – мой.
А чалавечы – пчол.

Начная зорка дагарае ў небе.
І з гэтай зоркай дагараю я.

## МАЁЙ МАТУЛІ

Мяне бяда шукае,
Бо я яе чакаў.
Мяне бяда гукае,
Ды я маўклівы стаў.

Адчуў я подых згубы
На стромкай вышыні…
Я маці роднай любы!
Мне трэба цеплыні!

І зноў тваё каханне
Мне дорыць адкрыццё:
Яшчэ не час расстання,
Не час губляць жыццё.

* * *

Спявае дзяўчына з чорнай касой.
Амый яе, ранак, чыстай расой.
Хай песня, як промень,
мне дорыць святло…
І боль, які быў,
як рукою зняло.

І вабяць ізноў да сябе ручаі,
І сонца ў нябёсах, і дрэвы ў гаі…
Спявае дзяўчына… Паклікаць яе?
А можа, пакліча яна да сябе?..

**КВЕТКА**

Кветка ўночы закрыта,
Кветка ўночы забыта.
Кветка свае летуценні
Хавае пялёсткаў адзеннем.

Глядзіце на кветку ўночы,
Пакуль не прытомяцца вочы.
Аддайце вы ёй пацалунак,
Яна вам – ад смерці ратунак.

Што ведама ёй – не раскажа,
Куды нам ісці – не падкажа.
І бездапаможна ў маўчанні,
Як людзі ў апошнім каханні.

* * *

Смак мёду на губах маіх – імя тваё.
Без зроку бачыў бы
і чуў бы я без слыху
Адну цябе – каб толькі ты была.
І шанаванне, дрогкае ў малітве:
Жаданая, каб толькі ты жыла!..

Мая малітва сёння – назаўжды,
Бо адцвіла дзяўчына ў гэты дзень.

…І карагодам на зямлю злятала,
І так павольна ападала долу
Чаромха – быццам плацце, у якое
Нявеста не хавала белых плеч.

* * *

Гарбата ў шклянцы. Шклянка на стале.
А веданне дае спакой душы.
Я ведаю, калі мне стане дрэнна.
Я ведаю калі.

Жывуць расліны коратка ці доўга,
А ўсё адно вада патрэбна ім.
Я не разлічваю наперад,
Што там будзе – у жыцці маім.

Я п'ю гарбату.
Моліцца душа…
Не схаладзець бы назаўсёды мне
да ранку.
Але гарбата не дае забыць
пра веданне маё.
Я ведаю, калі мяне не стане.
Я ведаю калі.

* * *

Вёска сэрцам адкрытым смяецца:
«Ты гарэлкаю вочы залі!»
Бацька Віця з гармонікам б'ецца –
Цесна песні ў жыццёвай пятлі.

Дзверы ўшырку – у снежнай завеі
Гнуткай постаці ўжо не відаць.
Ён у гэтай зіме не скалее,
Бо руку яму сцюжа падасць.

Бацька Віця! Шукаюць у снезе…
Бацька Віця! Спазніўся дамоў.
Бацька Віця! Блукаючы недзе,
Да мяне ты вяртаешся зноў.

Твая песня – у сон мой употай
Заляціць, і я ўбачу цябе.
Паланёны сваёй адзінотай,
Я зайдуся ў смяротнай журбе.

Белы снег атуліў твае рукі,
Белы снег прытуліў да зямлі.
Толькі чую гармоніка гукі –
Твае песні да неба пайшлі.

* * *

Дзяўчаты
з берага ракі
Пускаюць у ваду
святочныя вянкі.
Чый паплыве, а чый патоне.
Якой каханага знайсці, якой і не.

А я ляжу на дне.
Гляджу – плыве каханне нада мной,
Плывуць вянкі над галавой…

Адной дзяўчыначкі вянок святочны
Пачаў тануць і ціха мне на твар
упаў.

Кахай мяне, дзяўчыначка, кахай!
Не ведаеш, каго кахаеш ты.

* * *

Сёння, як змалку, выбегу ранкам
У споднім кашулі на двор.
Пазбыцца сябе хоць на пару хвілін,
Пазбыцца сябе і застацца сабой.
І сённяшні ранак – кароткі радок
У памяці хай застаецца маёй.
Далёка – руіны польскага замка,
Адтуль я – маленькі, не бачны здалёк.
І пах нараджэння вясковага ранку
Плыве да мяне вершаваным радком.

* * *

Кожны дзень – як подых учарашняга.
Ў кожным дні ўсё меншае мяне.
І таму пакрыху назапашваю,
Зберагаю – што другіх кране.

Што было са мной – прыгожае і вечнае
Расцвіце няхай – не зараз, а пасля.

…Рэшткі моцы – што дарога возьме.
Валацуга змрочны я цяпер.
Засяроджаны, устану з лаўкі – годзе.
Зачыню вароты. Падыму каўнер.

* * *

Калыска з дзіцяткам
Каля яблыні старой.
Размаўляе з немаўляткам
Ствол з шурпатаю карой.

А дзіцятка цягне ручку
Расказаць далонню сны
І адчуць зямную скруху
З цёмным пахам даўніны.

Ціха схіліць вецце дрэва:
Яблык сонечны – вазьмі!
І скажы – яшчэ няўмела –
Непачутае людзьмі.

* * *

Вяртанне маё –
з рэчаіснасці ў сны,
А сны мне вяртаюць пакуты.
Я зноў у палоне апошняй вясны,
І зноў я табой не пачуты.

І не апрытомнець ад смутку,
І не знайсціся ў вясне.
І сябра раскажа мне чутку,
Што памёр я – у сне.

## ГАДАВІНА ВЯСЕЛЛЯ

У малечай задуме, са смерцю ў грудзях
Пакінуў я хату — чужыя ў гасцях.
Вясельныя песні за гэтым сталом,
А мне ад вясельных — у грудзі калом.

А мне ад вясельных —
хоць плач, хоць маўчы,
Бо гэтыя песні памерлі ў душы.
Іголькі самота і смерць у грудзях.
Пакінуў я хату — чужыя ў гасцях.

* * *

Калі ты хочаш
я пайду адсюль
паветра
дыхаць
ведаць і не ведаць
на сонечны ратунак
наўздагон
вяртанне
частка
што было памерла
не засцяць слёзы
бачнае здалёк
халодны верад
ажывіцца
падзякай ранку
росы
мне баліць
калі ты хочаш
цяжка без адказу
калі ты хочаш
я пайду адсюль

* * *

Я па калені ногі
у серабро
Па локаць рукі золатам акрыў
Каб у агні мне дух не заняло
Каб у дарозе сэрцам не астыў

Высока дзьмухавец а не баіцца ветру
Вавёрка птушка дрэў вавёрачка вавёрка
Ты цёплы камячок а я халодны хлопец
Ты сонца дрэў а я маўчанне траў

Гамоняць ціха тонкія яліны
А пад табою гнуткія галіны
Вавёрка дзьмухавец і ёй
не страшны вецер
Вавёрка дзьмухавец і ёй
не будзе смерці

А я як ноч
Як прыйдзе дзень
Як прыйдзе дзень ліхтарык патушу

* * *

Белы профіль на фоне белага саду.
Я еду ў трамваі – а профіль
так блізка плыве…
Гэта дзяўчына – са мной у трамваі
побач,
Гэта дзяўчына побач са мною
па садзе плыве.

Ад адзіноты
лека ёсць такое:
Ідзі зімой у белы сонны сад,
Між дрэў аснежаных
шукай сабе спакою
Як дрэвы, стань – і не спяшай назад.

У белым садзе – белая дзяўчына.
Трамвай паклаў руку сваю на ток.
Вось бразнуць дзверы.
Выйсці – немагчыма.
Куды я еду? Знікла ты – нашто?

## СЦЯЖЫНКА

Ой, спыніся, нетаропкая сцяжынка!
З тваёй няспешнаю хадой не паспяваю я.

Падсякае корань вострае лязо,
Падмінае цела груз нялёгкі,
Падмінае думкі чорнае зацьменне…
Ой, спыніся, нетаропкая, – хаду сваю прыцішь!

Не гані мяне – там вогнішча чужое.
Там мяне не ведае ніхто.
І чаму ж ты не пытаеш – хто я?
І ў бары тваім спыніўся я – нашто?

Даўжыню жыцця мы вымяраем крокам.
Я ж учора цудам не памёр.
Зразумеўшы, што сцяжынка – шлях зямны мой,
Што бажніца захавана ў лесе
І яе знайсці павінен я.
Шмат разоў я збочваў са сцяжынкі,
Падаваўся я ў сляпы гушчар
Шмат разоў… Вяртаўся.
І не збочыць.
А па сцежцы – да бажніцы той.

«Толькі я падамся напрасткі.
Часта замінае нам жыццё…
Асабліва мне і асабліва сёння».

– Адыдзі! І прэч, зацьменне!
Я не дам… Я утрымаю веру…
Мушу жыць, і сцежкай – да бажніцы.
Падмінае цела груз нялёгкі.

* * *

Шкадую я сябе патроху і пацiху,
Каб не наклікаці якое-небудзь ліха…
За хатай вэлюмам ахутаўся язмін,
Як бы заліўся белымі слязьмі.
Здалеўшы гразь, квітнее лугавіна,
І ўжо закрасавала тапаліна,
І ветрык белы пух з яе нясе
На тонкую самотную каліну,
Што ў полі адзінокая расце —
Так шчасце побач з горам зацвіце
І дасць яму палёгку пакрысе…
У загоне светлым жабы завядуць
Гаворку ціха пра маю бяду.
І светлячок запаліць свой ліхтарык,
І ўбачу я дзявочы мілы тварык,
Што пазірае ў цьмянае вакно…
Хай вечна свежым будзе твой вянок,
І лёгкім крок, і гнуткаю пастаць,
Не стоміцца хай шчасце цалаваць
Тваю ружовую шчаку,
    тваю ласкавую руку…
Ды толькі болей, калі ласка, не прыходзь
У гэты дом, дзе сам я — толькі госць.
Бо як не вычарпаць з калодзежа ваду,
Так не забраці і табе маю нуду.
Фарбуе восень клёны у бурштын.
Такі вясною я. Таму мяне пакінь

* * *

Як кветкамі пахне ў хаціне маёй,
У хатачцы роднай з матуляй старой!
Была ж і матуля калісьці малой...
Пралескі збяру, прынясу я ў пакой.

Я кветкі сабраў і прынёс да цябе,
А следам у хату і вечар ідзе.
Мне ставіць матуля паесці на стол,
А кветкі запоўняць і неба, і столь.

Журботна зіхцяць над табой васількі.
Шкада, што тужлівы выходзіць вянок.
Праходзяць над гэтай зямелькай вякі,
А радасці мала ў вачах мацярок.

Як кветкамі пахне ў хаціне маёй!
Хацеў весялосці, а маю спакой.
І вось я сяджу ля цябе маладой,
І пахне пралескай у хаце маёй

* * *

Сэрца – што яблык-антонаўка, спелая чырвань.
Сэрца – што птушка, якая імкнецца у вырай.
Жадае любові і ласкі ад нас вымагае,
Смага ў пачуцці і вечная прага спаткання.
Самота і скруха точаць яго безупынна,
Покуль яно не ўпадзе ў халодную гліну.
Сэрца святое у хлопца і ў кволай дзяўчынкі,
Розуму сэрца даруе нядобрыя ўчынкі.
Сэрцам жывіце, і Бог у бядзе вас не кіне.
Здрадаю толькі не рушце – бо сэрца астыне.

* * *

Каханая кахае не мяне,
Пашчасціла не быць мне любым…

Блукаць па горадзе
між цьмяных ліхтароў,
Знайсці той тэлефон, што голас твой
мне дасць пачуць.

А тэлефоны ўсе зламаны,
І ўсе дарогі разарваны,
ніводная не памятае нас.
Надзея – на тваё каханне.
Надзеі той ліхтар не згас.

* * *

Снежная скруха. Лучына дыміць.
Хочацца легчы. Сэрца баліць.
У снежную далеч, у снежную бель
Прыходзяць паэты з далёкіх зямель.
Прыходзяць у хаты памерлых дзядоў
Прыходзяць –
і там не знаходзяць сяброў.
Старая кабета пад іхнім вакном
Ім кажа:
«Усе мы заснем вечным сном».
Паэт, не зважай! А лучына дыміць…
І хочацца легчы – бо сэрца баліць.

## КАЛЫХАНКА

Зраблю вам пінгвіна,
каб вы не сумавалі.
З белай тканіны і чорнай тканіны
Цацку зраблю вам.
Няцяжка й нядоўга –
не пройдзе хвіліны
Пінгвінчык гатовы,
а ўсё ж нежывы.
Пахукаю ў тварык –
Яму каб цяплей…

І я буду жывы,
Пакуль вам так смешна,
І ён будзе жывы,
І будзе так вечна.

…Не хукайце ў тварык –
Разбудзіце мары.
Ваш белы пінгвінчык,
Мой чорны пінгвінчык
заснуў.

## СНЕГ

Балюча, пякуча, гаюча
Падае белы дым.
Камусьці душу астудзіць,
Камусьці быць маладым.
Чамусьці прыгожыя кветкі
На могілках толькі растуць,
Чамусьці людзі старыя
Хораша гэтак пяюць…
Вочы стаміліся працай –
Не хочаш, а мусіш спачыць.
Вечна душа ў нястачы…
І ўсё-ткі – як хочацца жыць!

* * *

Я свой апошні верш не пакажу нікому.
Я свой апошні верш схаваю ад сябе.

Павінна ў свеце Тое быць,
што невядомым застанецца нам.
Павінна ў свеце Тое быць,
што невядомым застанецца мне.
Павінна ў свеце Тое быць,
што на лісце паперы
не выказаць ні словам, ні крывёй.

Я свой апошні верш не пакажу нікому.
Я свой апошні верш не прачытаю сам.

* * *

І прыйдзе час, калі вяртацца позна
І немагчыма не вяртацца – прыйдзе час.

Маё ты свята. Ты маё святло.
Цябе не ўбачыць, бо вяртацца позна.

І снег апошні
Упадзе.
І мне не дасць
дагаварыць і дамаўчаць,
Бо ён апошні.

А ты пачуць хацела: што скажу?

## ПЛАЧ БЯРОЗЫ

Бяроза ў лесе – белая царква.
Дубы і ліпы, елкі – прыхаджане.
Тут і мая схіліцца галава,
Тут побач з дрэвамі
                    і я ў задуме стану.
Тут снег упаў. А Бог сказаў:
«Я бачу вас...
              Я бачу – моўчкі, бачу.
Я нібы снег, да вас лячу.
Я на зямлі, нібы бяроза, плачу».

* * *

Іду ў царкву.
Здалёк яе відаць.

Калядны дзень. У сонечным святле
Крыж залаты заззяў – і чырванее.
Душа без парыванняў спакайнее,
Але душа стамілася ў царкве.

Святы айцец нагадвае Пілата.
Натоўп гудзе. Іуда – кожны з нас.
Пра Бога ўспамінаем мы на свята,
Забыць каб потым на астатні час.

Тут залаты амбон, свяшчэнны кут...
Не ведаю, дзе ісціна, але яна –
                              не тут.

* * *

Што нада мной? Тваё распяцце.

Яшчэ Хрыста не прывялі.
Яшчэ не мовілі пракляцця
Яшчэ... Яшчэ не паднялі
на крыж Яго.

А вучні лепшыя – у храме:
«Куды ісці нам? Падкажы!»
А хто ж Яго загоіць раны,
Яго заменіць на крыжы?

* * *

*Юліі*

У Дантавым пекле галінкай
Жывучы, ужо не схлусіш.
На зломе яе крывінкай
Ускрыкнуць: балюча! – мусіш.

Дык лепей – у садзе каханай
Быць ружай Яе бажніцы.
І што ад таго, што ранкам
Устромяцца ў сэрца нажніцы?

У вазе Яе букету
Быць кветкай пяюча-мядзвянай,
І ўсё ж – назаўсёды калекам,
І ўсё ж – незагойнаю ранай...

* * *

Бяліў мой бацька дрэвы пазаўчора.
Ў зялёнай квецені суцішылася сёння
Мая душа.
Успамінаю думак чорны бег.
Яны знікаюць, калі толькі я
Слабыя вочы ў шэрань валасоў
Тваіх хаваю. Гору не бываць!
На колькі вёснаў маладзейшы
за цябе я,
На столькі ж восеняў я за цябе
старэйшы…
Пабеленыя дрэвы ў гэты вечар
Адгоняць смутак успамінам дня;
З якой нагоды сёння гараваць,
Калі яны так пышна зелянеюць?
Але прашу цябе, я аб адным прашу:
Ты не ўкладай надзей у гэтае лісцё.
Калі, дай Бог, ты да мяне прыедзеш
Наступны раз – ты ўбачыш, як яго
Халодным восень сцеле дываном…
Ты не пужайся, што пяю ў мінор.
Я сёння проста стомлены П'еро.

* * *

«Прабач, я вярнуцца павінна…»—
Сказала, і ўжо не аспрэч.
Каханне асудзіш бязвінна
Пражыць без званкоў і сустрэч.
«Павінна вярнуцца да мужа,
Без мяне ён не зможа…» Маўчым.
Між цёмных бяззорных калюжын
Ісці мне ў свой кут на спачын.
…І ў лужыне зорка засвеціць,
Калі загарышся душой.
Адступіць нуды беспрасвецце,
Засцелюцца вочы імжой.
Успомню спякотнае лета.
Як дымна ў кавярні!.. Зіма.
Адно зразумееш — гэта
Тое, што выйсця няма

**ПАЭМА НЕПРАЧЫТАНАГА РАМАНА**

Гэта ліст, які ніколі не будзе адасланы – туды не даходзяць лісты.

Давай пагаворым з табою, дружа, садзіся бліжэй да святла – нам заўсёды так не хапала святла... Увесь час засцілі чужыя постаці, позіркі – я так і не змог пагаварыць з табою Тады, давай жа пагаворым Цяпер.

Ты помніш, як мы атрымалі заданне напісаць сачыненне па кнізе, якая нам найбольш спадабалася? Ты помніш Той дзень?

Помніш... Якое прыгожае слова. Вось і ты стаў для мяне дарагім успамінам, і я таксама некалі стану для некага ўспамінам, але хто ўспомніць апошняга?

«І таполі знікаюць, але след іх азёрны светлы», – так, здаецца, у Лоркі? Ты пакінуў светлы след у маёй памяці, і табе мой маленькі рэквіем – мая нягучная песня...

Я клічу некага, а каго клічу –
не ведаю, а той, каго я клічу,
чуе і не ведае, хто яго кліча...

Ёсць вуліцы прамыя і крывыя, доўгія і кароткія. Ёсць словы – як пачуцці – брыдкія і прыгожыя. Ёсць словы.

Мне заўсёды здавалася, што прамыя вуліцы – гэта яснасць, гэта ўсё зразумелае, а крывыя і маленькія – гэта наша думка: у ёй усё цьмяна, яна раптам пачынаецца і раптам абрываецца, у ёй няма таго, што людзі называюць сэнсам; яна буравіць наш мозг вельмі мала – і ўжо няма яе. І не дай вам Бог цікавасці да цёмных вуліц і чалавечых думак: там жудасна і страшна, там...

Хлопец устаў з месца раней за ўсіх. І адразу ўсе паглядзелі на Яго: хто спадылба, каб той не заўважыў, хто адкрыта, угледаючыся ў яго тар, як бы жадаючы адшукаць там тое, што адрознівае Яго ад усіх.

«Я ўстаю. Так, я ўстаю», – падумаў, пэўна, хлопец. І адразу заўважыў, што ён ужо стаіць каля стала настаўніцы і падае ёй лісток.

«Спазнілася думка... Ці я яе абагнаў?»

Ён падышоў да дзвярэй, адчыніў іх і пайшоў па калідоры. Я не раз бачыў, як ён ходзіць – намацваючы дарогу нагамі; ці ён не верыў вачам?

А пасля заняткаў... усе, хто пісаў сачыненне, не пайшлі адразу, а ўзялі Яго лісток і сталі чытаць па чарзе, угледаючыся ў яго почырк. Там было шмат недакладнасцяў, і я пакідаю іх – думка не выбірае мовы, думка не выбірае шляху, думка не можа быць хворай – можа быць хворым мозг, які нарадзіў яе.

Семнаццатага сакавіка.

Сачыненне.
Чым мяне ўсхваляваў раман,
якога я не прачытаў.
План.

Кароткія звесткі аб аўтары.
Тэма і галоўная думка твора.
Калі і дзе адбываюцца падзеі.
Галоўныя героі. Іх характары і ўчынкі.
Што асабліва ўсхвалявала ў творы.

Аўтар гэтага твора, напэўна, вельмі вядомы дзеяч беларускай літаратуры. Ён калісьці нарадзіўся, дзесьці выдатна вучыўся. Дзесьці быў выдадзены яго першы зборнік. Ён атрымліваў узнагароды, а можа, і не.

Адзін з яго найбольш значымых твораў – раман, якога я не прачытаў. Галоўнай думкай твора было паказаць рост або падзенне чалавечай духоўнасці. Каб мы задумаліся і зрабілі вывады.

Месца, дзе адбываюцца падзеі, выбрана невыпадкова. Яно адпавядае галоўнай думцы твора, узмацняе яе.

Таксама невыпадкова выбраны і галоўныя героі. Характары і ўчынкі іх вельмі разнастайныя. Ёсць людзі добрыя і злыя, ліслівыя і праўдалюбцы, разумныя і дурні, ціхія і буйныя, мужныя і труслівыя, сільныя і слабыя. І ўсе гэтыя рысы характару праяўляюцца ў самы кульмінацыйны момант твора. Героі ваююць і перамагаюць, любяць і ненавідзяць, і гэтак далей. І, гледзячы на іх, мы разумеем, як трэба жыць і што самае каштоўнае ў жыцці.

І гэты твор усхваляваў мяне так, што я вырашыў напісаць сачыненне. А прачытаўшы сачыненне, я зразумеў, чаму я не прачытаў гэты твор.

Вось бачыце – я нават прапускаю радок, каб было відаць, дзе канчаецца сачыненне. Канечне, яго напісаў хворы чалавек. Вам шкада гэтага чалавека?..

Чалавек робіць, што хоча. Але што можа хацець хворы чалавек? Ён хоча тое, што хоча яго хвароба. Яна вядзе яго цьмяным калідорам – на чырвонае святло святлафора, вядзе яго між машын. Але хвароба бароніць яго ад смерці людской – каб аддаць яго сваёй смерці. Правесці вас гэтым калідорам – калі твае крокі падаюцца табе крокамі пагоні за спіной, калі на тварах людзей вакол цябе ты чытаеш іх думкі аб табе – а гэта Твае думкі, гэта хвароба гуляе з табой у люстэрка, – правесці вас гэтай дарогай?

...На чым я спыніўся? Ён выйшаў... Я ўжо казаў, ён мацаў нагамі дарогу, як бы шукаў на ёй прыкметы, вядомыя яму аднаму – яны казалі яму, куды ісці.

Час ад часу ён вяртаўся на колькі крокаў назад – як быццам трэба было ўспомніць яму апошнія крокі, каб ісці далей; гэта і ёсць

хвароба – помніць кожны крок, які прайшоў, і шукаць дарогу наперад.

Я памятаю, як ён першы раз увайшоў у аўдыторыю – увайшоў, як усе, і сеў на самае сонечнае месца. Ён любіў сонца.

Хутка ўсе зразумелі, хто ён – па асобных учынках... усе зразумелі і адцураліся ад яго – як звяры адразу вылучаюць сярод сябе слабейшага ці хворага, там і мы. Але ніхто яго не крыўдзіў і не турбаваў.

...Ён увайшоў у сталоўку, нешта паставіў на паднос... Ён як бы ўзважваў на ім «меру жыцця і меру смерці», як сказаў адзін беларускі паэт-філосаф, а ўсё даўно было ўзважана і вырашана. Ён узяў нешта і сеў за стол. Паглядзіце на яго спіну. Ёсць спіны, якія чакаюць удару, а гэта была спіна, якая атрымлівала ўдар кожны момант – і яна прызвычаілася да ўдараў-позіркаў. Мабыць, яна не адпачывала нават у час яго сну. Правесці вас дарогаю яго сноў? Гэта адзінае месца (як ні дзіўна), дзе хвароба не валодала ім... Але і там яна знішчыла амаль усё лепшае – як карціна, на якую нехта лінуў кіслатой – засталіся стракатыя колеры, прыгажосць фарбаў – там нічога не зразумець, але хораша, пэўна, яму было толькі там...

Вясна вельмі ўжо падобна была на восень – і дождж праз сіта, і сонца нейкае слабое...

А ён ішоў.

Ён зайшоў у кінатэатр, але выйшаў адтуль, не купіўшы білета на сеанс; ён падышоў да пяціпавярховага дома, але нават не адчыніў дзвярэй. Гэта як гульня – нехта кажа табе: холадна, холадна, цяплей, горача, зноў халадней.

Вось ён сышоў з асфальту рэзка ўбок і сеў на траву.

Ідуць па асфальце людзі, кожны па сваёй справе, і раптам Адзін з іх сыходзіць з асфальту на траву...

Ён прысеў на траву, што пачала прабівацца з-пад леташняга лісця, і ўбачыў, як жывая травінка, цягнучыся да сонца, праткнула спрэлы лісцік і цягне яго ўгору, як маленькі трупік; цягне яго збалелае цельца, каб паказаць сонцу: глядзі, я расту, і не скідаю яго – хай парадуецца і Ён, мёртвы, але мёртвы Не Да Канца, табе, Ярыла, хай парадуецца, сонейка, табе.

...Не, ты быў свабодны не толькі ў сне. Калі ты слухаў музыку Баха, вярталіся да цябе прыкметы быцця – людзі вакол цябе атрымлівалі сапраўдныя аблічча, і гукі віяланчэлі і аргана выціскалі з твайго мозгу ракавую пухліну хваробы, і тады, седзячы на цвёрдай лаўцы касцёла, ты адчуваў тое, што між людзьмі называецца шчасцем.

…І Яна прывяла Яго на бераг Свіслачы. І тут загучаў арган. Ён граў недзе блізка, і хлопец пайшоў на гук…

Холадна. Цёпла. Горача…

Ты сядзіш на цвёрдай лаўцы касцёла, і лашчыш руку незнаёмай дзяўчыны, і адчуваеш тое, што людзі называюць шчасцем…

Ён адпусціў парэнчы моста над Свіслаччу і паспрабаваў прачнуцца, бо немагчыма, невыносна пругкім і шчыльным стала паветра; Ён сутаргава глытануў паветра – а гэта была вада, хвароба ў апошні раз пасмяялася з яго, каб назаўсёды пакінуць, каб назаўсёды адпусціць.

Ёсць словы – брыдкія і прыгожыя, ёсць словы… Ці тыя словы я сказаў пра Цябе?

І навошта я сказаў іх? Навошта… Проста ёсць на свеце творы, якія вы ніколі не прачытаеце, проста ёсць на свеце вуліцы, якія вы так і не зможаце прайсці да канца, проста ёсць на свеце вочы, у якія цяжка глядзець.

## ВЕРШ НА РАЗВІТАННЕ

– Сустрэнемся на плошчы Перамогі,
Сустрэнемся ля Вечнага агню…
Так, мы з табой зусім як піянеры.
Дык чым мне вечар твой заняць,
дзяўчынка?
Я павяду цябе, куды захочаш ты.
У філармонію, а можа, у тэатр?
Калі захочаш, сходзім у кавярню –
Лікёру возьмем і лімона з цукрам.
Не хочаш? (Што ж, табе ў душы я
ўдзячны.
Паквапіцца пакуль не здольна ты
На бедныя студэнцкія фінансы.)
Пасля цябе праводжу я дахаты.
Так, гэта проста звычка між людзей,
Ці, кажучы інакш, адвечны рытуал.
Трымаць мяне ты будзеш за руку
І пачытаць свае папросіш вершы.
Хіба табе адмоўлю ў гэтым я?
«Я, твой лісточак глогу ці вярбены
Зламаная, раструшчаная кветка –
Я памяць пад абцасамі дзяўчыны…»

Куды з табою мне пасля ісці?
Ты ж ведаеш, што правілы ў такой
Гульні – звычайныя.
Яны ж усім вядомы.
Я спадзяюся – мабыць, і дарэмна –

На тое спадзяюся, што ў цябе
Спакою, такту хопіць, каб маўчаць
Аб тым, пра што так часта мы гаворым.
І не пытацца: «Ты мяне кахаеш?»
Ты не пытайся – гэта супраць правіл.

Ты ведаеш, я так люблю гуляць
Па горадзе, без мэты і без сэнсу.
У гэтым сэнс – забіць, забіць свой час
(Калі назваць такое можна сэнсам).
Сказаў паэт: «Так у жыцці бывае –
Калі не ведаеш ты, як забіць свой час,
Твой час цябе паціху забівае».

Ты ведаеш, я так люблю гуляць…
Чаму з табою? Я табе скажу.
Ты першая, якую я сустрэў.
Ты не пакрыўдзілася? Ну, і дзякуй Богу.
У тым, каб не сустрэла ты мяне,
А я цябе – зусім жа не было б
Не тое што няшчасця, а нічога,
Аб чым хвіліну варта шкадаваць.

Заўсёды радасці, якая тут, між нас,
Хапае ненадоўга. Гэта праўда.
Таму ты не трымайся за яе.
Мы ёй – прыстанак; гэтак будзе лепш.
Хіба мяне сама ты адштурхнеш
І пойдзеш, і цябе я не паклічу?

Я – сакавік, якому ўжо ніколі
Не стаць красавіком. Што, красамоўна?
Я ўжо спыніўся у сабе самім.
Вось я іду – а хочаш, усміхнуся?
Вось я іду – а хочаш, пацалую?
Калі смяюся – крывіцца мой рот.
Ты думаеш, я тут? Мяне няма.

Так, да цябе ў мяне была дзяўчына.
Не помню я – а ці кахаў яе?
Ты ведаеш, мне памяць узнаўляе
Пах валасоў, усмешку яе, вочы,
А тое, што стаіць за гэтым словам…
Яго не помню – разам з ім я знік.
Я там застаўся – можа, не вярнуся.
Аб тым не думаю: напэўна, не вярнуся.

Пытаешся: былі сябры ў мяне?
Мае сябры? Яны былі, вядома.
І кожны з іх чамусьці выбраў лёс
Быць свечкаю ў журботны гэты век –
Век электрычнасці і яркага святла.
Так-так, яны свяціць хацелі ў цемры.
Але вакол было святло – таму
Яны пайшлі, пайшлі адсюль у цемру,
І там гараць, і свецяць мне адтуль,
І клічуць, клічуць, клічуць,
клічуць, клічуць…
Пытаешся: а ці пайду за імі?
Не, не пайду – для гэтага слабы.

Пытаешся, што я яшчэ люблю?

Я на тваім каўнерыку люблю
Любую парушынку і сняжынку.
Жыццё мяне вучыла вельмі доўга
Любіць і заўважаць усё малое –
Вялікага не дадзена ў жыцці.

Люблю кавярні, дзе гарыць святло.
Там ведаюць мяне, але не любяць.
Чаму? Ну, гэта цяжка растлумачыць
Так хутка. Я ж усім чужы,
Мой позірк адштурхоўвае жывое.
Табе пара, напэўна. Поль Верлен
Склаў верш бы нам з табой на развітанне.
Я не магу, бо знішчыць не хачу
Расстання спеўнасць вершамі слабымі.
Заўсёды радасці
хапае ненадоўга,
Але ж – лімон і цукар, і лікёр.
Забудзь усё, што я табе казаў,
Ды, мабыць, акрамя апошніх слоў,
Што маюць рэчыўны і непаўторны смак.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

## Змест

Алесь Разанаў. Папярэдняя пара
«Не цвіце яблыня гэты год…»
Блізняты
Павук
Божая пазыка
Арэлі
Шкло
«— Ты баішся плыць?..»
Хованкі
Прагаліны
Восень
Крок
«Хочацца зрабіць болей, але не атрымліваецца…»
Арган
Бяроза
Адзін
«Ехалі з сенажаці дзед і я…»
«Да змяркання яшчэ гадзіна…»
Шлях
Могілкі
«Пазбягаю людзей…»
Знікненне
Дамова
Вагі
Атрута
«Павага да асяроддзя…»
Жабрак
Матылёк
«Рэжу яблыкі, рэжу і рэжу… »
Жоўтая кашуля
Зямля
Моўчкі

«Словы ўвабралі далечыню...»
Бусел
Настаўнік
Бацька
«Святла струмені пакідаюць нас...»
«Увечары выходжу на поле...»
«Хлопцы і дзяўчаты з Гарадзішчаў...»
Вестка
Сведка
«Мне маці перахрысціць спіну...»
Прэлюдыя
Не было...
Пчалы пачатак — мой...
Маёй матулі
«Спявае дзяўчына з чорнай касой...»
Кветка
«Смак мёду на губах маіх — імя тваё...»
«Гарбата ў шклянцы. Шклянка на стале...»
«Вёска сэрцам адкрытым смяецца...»
«Дзяўчаты...»
«Сёння, як змалку, выбегу ранкам...»
«Кожны дзень — як подых учарашняга...»
«Калыска з дзіцяткам...»
«Вяртанне маё — з рэчаіснасці ў сны...»
Гадавіна вяселля
«Калі ты хочаш...»
««Я па калені ногі ў серабро...»
«Белы профіль на фоне белага саду...»
Сцяжынка 66 «Шкадую я сябе патроху і паціху...»
«Як кветкамі пахне ў хаціне маёй...»
«Сэрца — што яблык-антонаўка, спелая чырвань...»
«Каханая кахае не мяне...»
«Снежная скруха. Лучына дыміць...»
Калыханка
Снег
«Я свой апошні верш не пакажу нікому...»
«І прыйдзе час, калі вяртацца позна...»
Плач бярозы
«Іду ў царкву...»
«Што нада мной? Тваё распяцце...»
«У Дантавым пекле галінкай...»
«Бяліў мой бацька дрэвы пазаўчора...»
«Прабач, я вярнуцца павінна...»
Паэма непрачытанага рамана
Верш на развітанне

Слінко В.

Апошні снег: Вершы, Паэма/Прадм. А. Разанава.— Мн.: Маст. літ., 1995.— 93 с.— (Першая кніга паэта).

ISBN 985-02-0054-5.

Першыя свае вершы Віктар Слінко напісаў у родных Івацэвічах. І з самага пачатку ён заявіў пра сябе як пра паэта, здольнага на эмацыянальны палёт і рэфлексійны пошук. У гэтым зборніку пераважае стылістыка нестандартнага верша. В. Слінко імкнецца ствараць версэты і верлібры. Інтанацыя юнацкай чысціні, шчыры юнацкі смутак дамінуюць у паэзіі маладога аўтара.